# ЯШЧЭ НЕ ЎСЕ ЗАДУМЫ МАЕ ЗДЗЕЙСНЕНЫ…

## ДА 85-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ІВАНА ЦІШЧАНКІ

*Калі б давялося рабіць выбар жыццёвай дарогі спачатку,*
*я пайшоў бы толькі ў фальклярыстыку.*

Іван Цішчанка.

22 мая гэтага года спаўняецца 85 гадоў з дня нараджэння выдатнага знаўцы традыцыйнай народнай культуры, даследчыка гісторыі фальклярыстыкі, літаратара і педагога Івана Кірылавіча Цішчанкі (1930 – 2001).

Біяграфія Івана Цішчанкі ўвасабляе шлях таленавітага беларускага хлопца са Слаўгарадчыны ў адукацыю, навуку і культуру, у вялікае жыццё*. Станаўленне асобы даследчыка адбылося ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі, дзе І. Цішчанка працаваў з моманту яго заснавання роўна 35 гадоў. Бібліяграфія напісанага ім** сведчыць пра разнастайнасць навуковых і мастацкіх зацікаўленняў: публіцыстыка і літаратуразнаўства, сцэнарыстыка дакументальнага кіно і мастацкая проза. Але галоўнай справай жыцця гэтага чалавека стала вывучэнне фальклору, асэнсаванне і раскрыццё яго вялікага гуманістычнага патэнцыялу.

Першыя публікацыі І. Цішчанкі пра збіральнікаў фальклору і літаратараў з'явілася ў 1956 г. З 1965 г. ён у складзе тагачаснага выдатнага калектыву сектара фальклярыстыкі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ўключаўся ў працу над шматтомным акадэмічным зборам беларускага фальклору. Рыхтаваў да друку пяць тамоў серыі "Беларуская народная творчасць": "Жартоўныя песні" (1974), "Песні пра каханне" (1978), "Сямейна-бытавыя песні" (1984), "Сацыяльна-бытавыя песні" (разам з В. Скіданам, 1987), "Прыпеўкі" (1989). Гэта была надзвычай грунтоўная і карпатлівая праца, што ўключала адбор і сістэматызацыю матэрыялаў, напісанне ўступнага артыкула і навуковае каментаванне тэкстаў. *"Займаючыся зборам і вывучэннем народна-паэтычнай творчасці, прынамсі, працуючы над падрыхтоў-*



**Іван Цішчанка з дзядзькам Іванам Рыгоравічам Цішчанкам, членам-карэспандэнтам НАН Беларусі, доктарам хімічных навук.** 1970-я гг.



**Уладзімір Васілевіч, Віктар Шматаў, Іван Цішчанка.** Вільнюс. 1977 г.

---

* Біяграфічны нарыс пра І. Цішчанку ўбачыў свет пасля смерці даследчыка ў кнізе: **Цішчанка, І. К.** З творчай спадчыны : навуковыя артыкулы, літаратурныя творы / І. К. Цішчанка; [навук. рэд. і аўт. уступ. арт. "З неапублікаванай спадчыны" А. С. Ліс]. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – С. 3 – 6.

** Бібліяграфію прац даследчыка да 1995 г. гл.: **Савік, Л. С.** Цішчанка Іван / Л. С. Савік // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. – Т. 6. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 230 – 232.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



**Іван Цішчанка** (справа) **і Уладзімір Васілевіч падчас фальклорнай экспедыцыі на Стаўбцоўшчыне з малодшай сястрой Якуба Коласа Марыяй Міхайлаўнай Бруй.** Канец 1970-х гг.

*кай шматтомнага зводу беларускага фальклору,* – пісаў даследчык ў 1986 г., – *я адчуў сябе, мушу прызнацца, шчаслівым чалавекам, бо непасрэдна прычыніўся да святая святых – духоўных скарбаў майго народа, у якіх выявілася яго глыбокая мудрасць і мастацкі геній, і ад гэтага, здаецца, сам стаў дабрэй душой і чысцей сэрцам. Галоўнае, усвядоміў, што знайшоў сваё месца ў жыцці*"*. У тым жа годзе за ўдзел у працы над шматтомным выданнем БНТ І. Цішчанка сярод іншых быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Асэнсоўваючы яго фалькларыстычную спадчыну, хочацца пазбегнуць традыцыйнага ў жанры юбілейнага артыкула храналагічнага апісання жыцця і творчасці і акцэнтаваць увагу на вызначальных момантах.

Іван Кірылавіч Цішчанка ўпершыню ў шырокім сацыяльна-культурным кантэксце даследаваў гісторыю беларускага народазнаўства другой паловы XIX ст. і стварыў цэлую галерэю партрэтаў этнографаў і фалькларыстаў, сярод якіх А. Кіркор, П. Шэйн, П. Бяссонаў, І. Насовіч, Ю. Крачкоўскі, Е. Раманаў, Я. Ляцкі, М. Доўнар-Запольскі, А. Багдановіч. Нарысы пра іх увайшлі ў выданні "Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50 – 60-я гады XIX ст." (1986) і "Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст." (1989).

Нездарма Арсен Ліс, даўні сябра і калега па Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, назваў Івана Кірылавіча "схільным да чалавеказнаўства". Менавіта І. Цішчанка напісаў пра класікаў беларускай фалькларыстыкі так, што сёння мы ўсведамляем іх як асоб у сваім супярэчлівым часе, разумеем канцэптуальнае поле тагачаснай навукі, барацьбу ідэй, узнікненне і развіццё новых падыходаў. Цішчанка-навуковец здолеў не толькі паглыбіцца ў біяграфію кожнага збіральніка, але і сфармуляваць матывацыю яго імкнення паказаць навуковаму свету багацце традыцыйнай культуры беларусаў. Такая якасць даследавання грунтавалася на шматгадовай працы аўтара ў архівах Санкт-Пецярбурга, Масквы, Вільнюса, Варшавы, знаёмстве з эпісталярнай спадчынай, рэдкімі і нават унікальнымі дакументамі. Біяграфічныя нарысы пра знакамітых этнографаў і фалькларыстаў, што выйшлі з-пад пяра І. Цішчанкі, непераўзыдзеныя сёння ў навуковым і сацыяльна-культурным значэнні, разам з працамі Г. Пятроўскай, У. Васілевіча, Г. Каханоўскага, Я. Саламевіча, В. Бандарчыка, А. Аксамітава і Л. Малаш ствараюць залаты фонд гісторыі беларускай фалькларыстыкі.

Хочацца тут сказаць і пра не здзейсненую да канца задуму Івана Кірылавіча – незаконча-



**Уладзімір Васілевіч, Іван Цішчанка і Віктар Шматаў на суботніку ў Батанічным садзе.** Мінск. Пачатак 1980-х гг.

* **Цішчанка, І. К.** Адказ на анкету // З творчай спадчыны... – С. 284.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ



**Іван Цішчанка, сын Якуба Коласа Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч, Сцяпан Александровіч.** Мінск. Пачатак 1970-х гг.

ную манаграфію "Беларуская міфалогія". Сёння дзякуючы А. Лісу, які ўклаў кнігу "З творчай спадчыны: навуковыя артыкулы, літаратурныя творы" (2004), мы маем магчымасць пазнаёміцца з некаторымі матэрыяламі гэтай вельмі значнай для яе аўтара працы. І. Цішчанка, выдатна эрудзіраваны фалькларыст, гістарыёграф, імкнуўся асэнсаваць міфалогію як тып свядомасці, вызначыць асаблівасці міфалагічнага светапогляду беларусаў. Ён паспеў распрацаваць тры знакавыя ўсходнеславянскія міфалагічныя "персаналії": Перуна, Ярылы / св. Юрыя, Валоса / св. Уласа.

Пры чытанні матэрыялаў незакончанай манаграфіі пазнаецца даследчыцкі стыль: зварот да навуковых першакрыніц, дакладнасць навукова-даведачнага апарату, багацце фактычных звестак. *"Толькі комплексны аналіз усяго фальклорнага матэрыялу і этнаграфічных з'яў,* – пісаў І. Цішчанка ў 1990-я гг., – *дазволіць аб'ектыўна разабрацца ў міфалагічным светасузіранні нашых продкаў"**. Асобныя высновы аўтар падае завострана, нават палемічна. Бясспрэчна, некаторыя тэзісы І. Цішчанкі адносна архаічнай свядомасці, ролі хрысціянства ў этнічнай гісторыі і традыцыйнай культуры беларусаў з'яўляюцца дыскусійнымі. Аднак заўважым, што ў 1990-я гг. міфалагічная праблематыка толькі-толькі пачынала распрацоўвацца ў беларускай навуцы. Таму напісанае ў той час І. Цішчанкам гучыць надзвычай моцна і сведчыць пра высокі даследчыцка-аналітычны ўзровень, зададзены аўтарам "Беларускай міфалогіі".

*Яшчэ не ўсе задумы мае здзейснены,*
*Я не знарок прыйшоў на гэты свет,*
*Найлепшай справаю, як песняю,*
*Хачу пазначыць свой апошні след.*

Паводле гэтых радкоў з верша "Тастамент" здаецца, што сваю навуку ён усведамляў як найвышэйшую форму творчасці. У 1986 г. Іван Цішчанка бачыў у ёй яшчэ шмат дзялянак, што чакалі яго працы. Гэта ўкладанне і публікацыя ненадрукаваных запісаў з калекцый З. Даленгі-Хадакоўскага, П. Шэйна, Я. Карловіча, П. Гільтэбранта, Я. Ляцкага; публікацыя эпістальярнай спадчыны выдатных народазнаўцаў – А. Кіркора, Е. Раманава, І. Насовіча, П. Шэйна, А. Багдановіча. Ён лічыў неабходным таксама перавыдаць найважнейшыя дарэвалюцыйныя даследаванні з-за іх бібліяграфічнай рэдкасці і нават недаступнасці для спецыялістаў.

Частка з таго, на што ўказваў І. Цішчанка, ужо здзейснена. Трэба ўзгадаць энцыклапедыю "Беларускі фальклор" (2005 – 2006), "Беларусы" Я. Карскага (2006 – 2007) у серыі "Помнікі гістарычнай думкі Беларусі", энцыклапедычны слоўнік "Міфалогія беларусаў" (2011) і інш. Але шмат яшчэ застаецца і новаму пакаленню даследчыкаў, якое сёння працягвае справу плеяды выдатных беларускіх савецкіх фалькларыстаў, годным прадстаўніком якой быў Іван Кірылавіч Цішчанка.



**Алесь Адамовіч і Іван Цішчанка.** Пачатак 1970-х гг.

Настасся ГУЛАК.

* **Цішчанка, І. К.** З творчай спадчыны… – С. 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ